# КРЫНІЦЫ ПА СЯЛЯНСКАЙ ГЕНЕАЛОГІІ БЕЛАРУСІ НА ПРЫКЛАДЗЕ ПЭЎНАЙ МЯСЦОВАСЦІ ПА МАТЭРЫЯЛАХ НГАБ (1795–1918)

**В. В. Урублеўскі**

У беларускай гістарыяграфіі апошнім часам пачынае актыўна распрацоўвацца пытанне шляхецкай генеалогіі. У той жа час мала ўвагі надаецца даследванню генеалогіі мяшчанскай і сялянскай. Дадзеная праца прысвечана даследванню крыніц сялянскай генеалогіі часу знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі. Яна носіць мікрагістарычны характар і прысвячаецца генеалогіі насельніцтва ў межах аднаго царкоўнага прыхода і, адпаведна, аднаго прыватнаўласніцкага маёнтка, межы якіх гістарычна супадалі. Для правядзення даследвання абраны маёнтак Целякова Уздзенскай воласці Ігуменскага павета. Да маёнтка, акрамя адпаведнага сяла належыў яшчэ шэраг населеных пунктаў, частка якіх потым увайшла ў склад Целякоўскага с/с Уздзенскага раёна. Таму ў даследванні стала ўжываецца штучная назва мясцовасці – Целякоўшчына.

Мікрагісторыя ставіць сваёй мэтай аднаўленне суцэльнай карціны ў маштабах аднаго паселішча або групы паселішчаў (мікрарэгіёна), вузкай сацыяльнай групы, а часам нават у маштабе адной сям’і або індывідуальнай біяграфіі. Наяўнасць такога прынцыпа апраўдвае неабходнасць з’яўлення і развіцця генеалогіі найбольш традыцыйнага сацыяльнага слоя – сялянства, што дапамагае стварэнню карціны паўсядзённасці, якая існавала ў пэўны гістарычны адрэзак часу на тэрыторыі пэўнай мясцовасці.

Праведзенае намі даследванне грунтуецца на неапублікаваных крыніцах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей – НГАБ). Галоўнай яго мэтай з’яўлялася прааналізаваць і абагульніць комплекс матэрыялаў па генеалогіі сялянскага насельніцтва ў межах асобнага царкоўнага прыхода, а таксама паказаць магчымасць распрацоўкі сялянскіх радаводаў і зрабіць пераход да іх практычнага стварэння. Назапашаная інфармацыя можа выкарыстоўвацца ў архіўных установах для ўліку генеалагічнай інфармацыі і выканання адпаведных запытаў па вышэй згаданай тэрыторыі.

Генеалогія знаходзіцца на сутыку крыніцазнаўства і мікрагісторыі. Так, з аднаго боку у даследванні разглядаюцца крыніцы з усёй паўнатой наяўнай у іх інфармацыяй. З другога боку – штодзённая гісторыя Целякоўшчыны, часу знаходжання яе ў складзе Расійскай імперыі. Калі крыніцазнаўства, перш за ўсё, занята вызначэннем інфармацыйнай каштоўнасці дакумента,

то мікрагісторыя даследуе тыя працэсы, якія на падставе яго можна назіраць. Генеалогія дапамагае звязаць абодва гэтыя накірункі адным аб'ектам – генеалагічнай крыніцай, суб'ектам жа выступаюць людзі – стваральнікі дакумента, а таксама тыя, хто быў у ім запісаны.

Храналагічныя рамкі ахопліваюць наступны перыяд: з 1795 г. (складанне першай рэвізскай сказкі на тэрыторыі Беларусі) – па 1918 г. (дэкрэт савецкай улады ад 20 студзеня 1918 г., паводле якога акты грамадзянскага стану павінны весціся выключна грамадзянскай уладай).

Сярод выкарыстаных публікацый метадычнага характару трэба узгадаць працы Дз. М і І. А. Антонавых [1], А. С. Залівакі [7], Т. С. Міхяёнак [9], В. Л. Насевіча [10], С. А. Рыбчонка [11], Л. М. Савёлава [12], В. М. Станішэўскага [13, 14], Н. М.Чыжовай [16], З. Л. Яцкевіча [17].

У працы выкарыстаны архіўныя фонды Мінскай духоўнай кансісторыі (ф. 133), Мінскай казённай палаты (ф. 333), Мінскага губернскага інвентарнага камітэта (ф. 142), Ігуменскай павятовай рэкруцкай прысутнасці (ф. 1500), Мінскага ўпраўлення земляробства і дзяржмаёмасцяў (ф. 27), Ігуменскага павятовага суда (ф. 160), Мінскай губернскай па сялянскім справам прысутнасці (ф. 242), Ігуменскага дэканата Мінскай рымска-каталіцкай епархіі (ф. 1234) і інш.

У даследванні звярталася ўвага таксама на даведачную і энцыклапедычную літаратуру – трохтомнік «Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён» [5, 6]; «Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права» [8]; «Фонды Национального исторического архива Беларуси» [15]. Неабходная ўвага надзяляецца зборнікам дакументаў («Белоруссия в эпоху капитализма» [2, 3], «Восстание 1863–1864 гг. в Литве и Белоруссии: сборник документов» [4] і інш.).

Генеалагічныя крыніцы падаюць нам інфармацыю аб такіх паняццях як імя, імя па бацьку і прозвішча чалавека, гады яго жыцця, месца жыхарства, сямейна-роднасныя сувязі. На падставе прааналізаваных крыніц можна зрабіць выснову аб тым, што асноўнымі элементамі для вылучэння генеалагічных сувязяў у межах пэўнай мясцовасці з'яўляюцца якраз тры асноўных элемента ідэнтыфікацыі чалавека (імя, імя па бацьку і прозвішча). Яны дазваляюць зрабіць пэўныя высновы аб карэннасці тых ці іншых родаў, распаўсюджанасці пэўных імён, сваяцкія сувязі. Неабходна ўлічваць і магчымасць змены прозвішча ў часе (напрыклад, Сымановіч–Шымановіч–Шымкевіч, Корша–Карп–Карповіч), а таксама наогул замену аднаго прозвішча другім пад уплывам пэўных фактараў (напрыклад сяляне вёскі Стрыгелы пасля пераводу ў іншыя паселішчы змянілі прозвішча Ганчар на Стрыгельскі). Важным паказальнікам, які можа ўказваць на сваяцтва з'яўляецца згадка ў крыніцах аб перасяленні

сялянскіх сем'яў з адной вёскі у другую. Гэта можа тлумачыць распаўсюджанасць у межах мясцовасці ў пэўны час пэўнага прозвішча. Вызначэнне гадоў жыцця грунтуецца як на крыніцах дакладнай фіксацыі (метрычныя кнігі), так і на крыніцах з прыблізнай фіксацыяй ўзросту (рэвізскія сказкі). Абедзве гэтыя групы крыніц, могуць з пэўнай дакладнасцю, вызначыць як дату нараджэння, дату смерці, так і дату заключэння шлюба. Асобай крыніцай могуць з'яўляцца і надмагільныя надпісы, грунтоўнае даследванне якіх яшчэ плануецца правесці.

Аднак генеалагічнае даследванне не павінна абапірацца толькі на «сухую» інфармацыю. Неабходнымі з'яўляюцца таксама такія крытэрыі як характарыстыка сацыяльна-эканамічнага становішча чалавека альбо пэўнай сям'і ў грамадстве, яго фізічнае апісанне, асноўны працоўны занятак, служба ў войску альбо ў дзяржаўнай установе і інш. Інфармацыю аб гэтым прадстаўляюць інвентары, рэкруцкія спісы, матэрыялы справаводства. Назапашаная такім чынам інфармацыя можа шырока выкарыстоўвацца для напісання сямейнай гісторыі.

Архіўныя крыніцы па дадзенай тэматыцы з фондаў НГАБ дастаткова поўна асвятляюць разнастайныя аспекты гісторыі Целякоўшчыны. Аднак існуюць і пэўныя прабелы, звязаныя з адсутнасцю ў архіве ранніх метрычных кніг (раней за 1835 г.) і спавядальных ведамасцяў Целякоўскай Пакроўскай царквы. Неадшуканы пасямейныя і прызыўныя спісы. Пэўныя цяжкасці складае адсутнасць на захоўванні асобнага фонда Целякоўскай Пакроўскай царквы. Аднак у цэлым узровень наяўнасці патрэбнай інфармацыі можна адзначыць як высокі.

Адной з задач працы з'яўлялася таксама вызначэнне адрознення паміж мікрагісторыяй і краязнаўствам і таго, якім чынам генеалагічнае даследванне можа быць карысным для гэтых галін навуковай і навукова-пазнавальнай дзейнасці.

Мікрагісторыя разглядае тыя характарыстыкі, якія маюць агульнасістэмнае значэнне і характэрны для ўсёй мясцовасці ў цэлым, у адрозненні ад краязнаўства. Праведзенае даследванне указвае на тое, што паглыбленая праца з генеалагічнымі крыніцамі садзейнічае актывізацыі распрацоўкі такіх накірункаў як дэмаграфія, статыстыка і анамастыка. Гэтым самым назапашваецца матэрыял, неабходны для мікра- і макрагістарычнага даследвання. Апрача гэтага генеалогія сялянскага насельніцтва пэўнай мясцовасці прадстаўляе бясцэнную інфармацыю і для мясцовых краязнаўцаў.

Генеалогія Беларусі, у цэлым, з'ўляецца неад'емнай і каштоўнай часткай гісторыі і культуры Беларусі. У сувязі з класавым падыходам, які існаваў у беларускай гістарычнай навуцы ў савецкі час, яна была амаль цалкам выключана з навуковага аналізу. Калі ў беларускім грамадстве павялічылася цікавасць да сваіх каранёў, да паходжання сваёй сям'і і

гісторыі свайго роду, генеалогія вяртаецца з небыцця і развіццё кожнага яе кірунку з'яўляецца першачарговай задачай для кожнага даследчыка генеалогіі.


**Літаратура**

1. *Антонов Д.Н., Антонова И.А.* Метрические книги России XVIII – начала XX в. М., 2006.
2. Белоруссия в эпоху капитализма: Сборник документов. Мн., 1983. Т.1.
3. Белоруссия в эпоху капитализма: Сборник документов. Мн., 1990. Т.2.
4. Восстание 1863–1864 гг. в Литве и Белоруссии: Сборник документов. М., 1965.
5. Гісторыя сялянства Беларусі. Мн., 1997. Т.1.
6. Гісторыя сялянства Беларусі. Мн., 2002. Т.2.
7. *Заливако А.С.* Историография генеалогии Беларуси (X–XXI вв.). СПб., 2004.
8. Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права. Мн., 1959.
9. *Михеенок Т.С.* Павичи – род крестьянский // Архівы і справаводства. 2001. № 2. С. 103–107.
10. *Носевич В.Л.* Традиционная белорусская деревня в европейской перспективе. Мн., 2004.
11. *Рыбчонак С.А.* Крыніцы па генеалогіі Беларусі XVI – пачатку XX ст.: Метадычныя парады. Мн., 2003.
12. *Савелов Л.М.* Лекции по русской генеалогии, читанные в Московском археологическом институте. М., 1994.
13. *Станішэўскі В.М.* Родословная Станишевских. Мн., 1997.
14. *Станішэўскі В.М.* Радавод сям'і Улашчыкаў: гістарычны нарыс. Мн., 2001.
15. Фонды Национального исторического архива Беларуси: Справочник. Мн., 2006.
16. *Чижова Н.Н.* Генеалогия крестьянского рода XVIII–XX веков. Тверь, 2004.
17. *Яцкевіч З.Л.* Радавод Максіма Багдановіча. Мн., 1999.


## ПАРАДАК ВЯДЗЕННЯ СПРАВАВОДСТВА ПА СКАРГАХ У БЮРО СКАРГАЎ НК РСІ БССР


### Н. У. Юркевіч


Першая трэць мінулага стагоддзя – час гіганцкіх сацыяльных катаклізмаў і патрасенняў, захаду і распаду традыцыйнай сялянскай культуры, фарсіраванай індустрыялізацыі краіны і суцэльнай калектывізацыі, што праводзіліся пад сцягам будаўніцтва сацыялізму. У зваротах знаходзілі сваё адлюстраванне ўспрыняцце рэвалюцыйных пераўтварэнняў звычайным чалавекам, яго погляд на прыроду і сутнасць новай улады, на новае дзяржаўнае і грамадскае ўладкаванне, яго сэнс і назначэнне, супастаўленне старых і новых парадкаў; рэакцыя насельніцтва на розныя мерапрыемствы бальшавіцкага кіраўніцтва, на падзеі грамадзянскай вайны, на палітыку «асаднага камунізму», харчразвёрстку на вёсцы, на ўзнікшыя ў краіне хаос і дэзарганізацыю; адносіны да правядзення новай эканамічнай палітыкі, фарсіраванай індустрыялізацыі і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.